*Жукава А. М.,*

загадчык сектара
міжнароднай дзейнасці
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

# ПЛЯЦЕННЕ НАРОДНАГА БЕЛАРУСКАГА ПОЯСА НА ПАЛЬЦАХ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паясы ў традыцыйнай культуры беларусаў займаюць адно з самых пачэсных месцаў. Без адмыслова аздобленых паясоў цяжка ўявіць традыцыйны народны касцюм.

Апісанні старадаўняга народнага побыту, звычаяў і абрадаў беларусаў не абыходзяцца без упамінання паясоў.

Пояс выконваў тры цесна звязаныя паміж сабой функцыі:

- утылітарную;
- дэкаратыўную;
- знакава-сімвалічную.

У мужчынскім касцюме ім абавязкова падпяразвалася кашуля, якая насілася навыпуск. Існавала павер'е, што падпяразаны чалавек мае абарону ад злых духаў. Пояс мужчыны насілі і з верхнім адзеннем.

Яшчэ ў мужчынскім касцюме пояс выкарыстоўваўся і для таго, каб мацаваць на ім розныя неабходныя рэчы: шабету з махоркай, крэсіва, ключы. Ідучы на працу, за пояс затыкалі сякеру, рукавіцы.

Ужыванне пояса ў жаночым касцюме было даволі разнастайным. Пояс прышываўся да паяснога адзення, замацоўваючы край спадніцы ці андарака. Свабодныя канцы прышытага пояса выконвалі ролю засцёжкі. На вузенькіх, павязаных на таліі, паясках жанчыны насілі розныя прадметы, напрыклад, ключы ад скрыні. Пояс, павязаны паверх світкі ці кажуха, надзейна фіксаваў адзенне на целе жанчыны, дапамагаў захоўваць формы касцюма.

З узростам наяўнасць пояса ў дзіцячым касцюме паступова станавілася больш абавязковай. Завязвалі дзеці пояс звычайна ў адзін абхват. Яго даўжыня вызначалася з разліку абхвату таліі і прыкладна 80 см на завязкі. Падпярэзвалі дзецям поясам і зімовае адзенне. У такіх выпадках, наколькі можна меркаваць па архіўных фотаздымках, паясы мелі значную шырыню. Імі маглі абкручваць стан два разы.

Практычнае ўжыванне пояса як у жаночым, так і ў мужчынскім традыцыйным касцюме лагічна спалучалася з функцыяй упрыгожвання. Святочныя паясы, у параўнанні з тымі, якія насілі кожны дзень, звычайна былі шырэйшыя, мелі больш прыгожыя ўзоры і з выдумкай аздобленыя канцы.



Мал. 1

Па звычайнай даўжыні шырокіх паясоў (220—240 см) можна меркаваць, што дарослыя мужчыны і жанчыны завязвалі іх у адзін абхват. Пояс накладвалі ззаду, пераводзілі наперад і тым ці іншым спосабам афармлялі месца завязвання. Варыянты павязвання знаходзім у кнізе «Беларусы ў фотаздымках Ісака Сербава. 1911—1912» (гл. мал. 1).

Самае шырокае прызначэнне мелі паясы ў паўсядзённым побыце. Вузкія паяскі мацавалі да самых розных прадметаў, якія служылі для пераноскі саламяных сявенек, каробак, збанкоў. Іх прышывалі ці прывязвалі да палатняных торбаў. На яго вешалі ключ ад хаты. Поясам спавівалі немаўлят.

Сярод традыцыйных абрадаў, у якіх найбольш разнастайна выкарыстоўваліся паясы, было вяселле. Захаваліся сведчанні аб тым, што іншы раз маладая на розных этапах вяселля раздавала больш за паўтары сотні паясоў.

Асноўная маса паясоў на Беларусі да пачатку XX ст. выраблялася ў хатніх умовах для патрэб кожнай асобнай сям'і. Займаліся вырабам паясоў у любую вольную хвіліну.

На Беларусі найбольш пашырана пляценне паясоў на пальцах, на сцяне, на калодачцы. Пляценне на сцяне (на спецыяльнай раме або любых паралельных перакладзінах) выконвалі пераплятаючы нацягнутыя пальцамі ніткі. Пляцёнка выпляталася з двух бакоў адначасова (пасярэдзіне ўтвараўся характэрны злучальны шоў). Пляценне на калодачцы (цыліндрычнай або прамавугольнай з адтулінай пасярэдзіне, вакол якой набіты цвічкі без галовак) падобна на вязанне пруткамі: папярэдне адзетыя на цвічкі петлі па чарзе перапляталі з рабочай ніткай (звычайна белай або чырвонай). Для трываласці ўнутр пояса прапускалі пучок нітак. Выплятаі таксама паясы-шнуры вязаннем вузлоў. Акрамя паясоў аналагічнымі спосабамі плялі аздобу для адзення, чапцы, пастухоўскія пугі і інш.

Спосабам пляцення на пальцах можна плесці плоскія і аб'ёмныя пляцёнкі, раздвойваць пляцёнку, на адной і той жа запраўцы пераходзіць ад адной формы пляцёнкі да другой. Плесці можна ў тры, чатыры, пяць і шэсць петляў. Падрабязнае апісанне даецца для пяці петляў. Адрэзаць пяць нітак даўжынёй 100—150 см, злажыць іх папалам. Атрыманыя петлі падраўняць, канцы замацаваць на



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Мал. 2



Фота 1

якім-небудзь нерухомым прадмеце. Петлі надзець на ўказальны, сярэдні і безыменны пальцы левай рукі, сярэдні і ўказальны пальцы правай рукі або наадварот (гл. мал. 2).

Рукі павярнуць далонямі адна да другой (гл. фота 1).



Фота 2



Фота 3

**Круглая пляцёнка**
(гл. фота 2, 3).

Паслядоўнасць

*1 этап* Безыменным пальцам правай рукі падняць за ніжні бок петлі, адзетыя на безыменны і сярэдні пальцы левай рукі (гл. фота 4), падхапіць за ніжні бок пятлю, адзетую на ўказальны палец левай рукі, і працягнуць яе праз дзве першыя пятлі (гл. фота 5). Развесці рукі ў бакі, зацягнуць пляцёнку (гл. фота 6). Пятлю з сярэдняга пальца левай рукі перамясціць на ўказальны палец той жа рукі, а з безыменнага — на сярэдні (гл. фота 7).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Фота 4



Фота 7



Фота 5



Фота 8



Фота 6

*2 этап* Безыменным пальцам левай рукі падняць за ніжні бок петлі, адзетыя на безыменны і сярэдні пальцы правай рукі, падхапіць за ніжні бок пятлю, адзетую на ўказальны палец правай рукі, і працягнуць праз дзве першыя пятлі (гл. фота 8).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Плоская пляцёнка**
(гл. фота 9)

Паслядоўнасць

*1 этап* Безыменным пальцам правай рукі падняць за ніжні бок петлі, адзетыя на безыменны і сярэдні пальцы левай рукі, падхапіць за ніжні бок пятлю, адзетую на ўказальны палец левай рукі, і працягнуць яе праз дзве першыя пятлі. Развесці рукі ў бакі, зацягнуць пляцёнку. Пятлю з сярэдняга пальца левай рукі перамясціць на ўказальны палец той жа рукі, а з безыменнага — на сярэдні.

*2 этап* Безыменным пальцам левай рукі падняць на верхні бок петлі, адзетыя на безыменны і сярэдні пальцы правай рукі, падхапіць за верхні бок пятлю, адзетую на ўказальны палец правай рукі і працягнуць яе

праз дзве першыя пятлі. Развесці рукі ў бакі, зацягнуць пляцёнку. Пятлю з сярэдняга пальца правай рукі перамясціць на ўказальны палец той жа рукі, а з безыменнага — на сярэдні.

*3 этап* Плесці далей то правай, то левай рукой папераменна. Закончыць пляцёнку, расправіць, пацягнуйшы за краі.



Фота 9

Пляценне на пальцах можна выконваць на нітках рознай таўшчыні і якасці. Гэта дазваляе надаваць вырабам, плеценым на пальцах, неабходныя ўжытковыя і мастацкія якасці. З тонкіх тасёмак атрымліваецца прыгожая тасьма, закладкі для кніг, шнуркі ў валасы і г.д. З тоўстых нітак можна сплесці дастаткова шырокі пояс.

Асноўным прыёмам, з дапамогай якога дасягаецца дэкаратыўная выразнасць у вырабах, плеценых на пальцах, з'яўляецца падбор каляровых нітак і парадак іх размяшчэння ў петлях. Выкарыстоўваючы ніткі толькі двух колераў у розных спалучэннях, можна атрымаць зусім непадобныя адзін да аднаго ўзоры. Колькасць узораў значна павялічваецца з увядзеннем трэцяга, чацвёртага і гэтак далей колераў. Пры пляценні на трох пальцах у адным вырабе можна выкарыстоўваць шэсць колераў, на пяці — дзесяць колераў, на шасці пальцах — 12 колераў.

Літаратура

Манахіня Васа (Селівончык, В. І.). Беларускія народныя паясы : тэхнікі вырабу, арнамент / Манахіня Васа (В. І. Селівончык). — Мінск : Беларус. навука, 2014. — 303 с., іл.

Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. — Мінск : БелСЭ, 1989. — 575 с. : іл. — С. 405.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ